**УСТАНОВА "БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА"**

# ШКОЛЬНІКАЎ СЯМЁН ПЕЙСАХАВІЧ

**МАСТАК-ГРЫМЁР, ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ КУЛЬТУРЫ БССР**

**17 КАСТРЫЧНІКА 1901 Г. – 7 МАЯ 1977 Г.**

# САГАЛЬЧЫК АЛЯКСАНДР САМУІЛАВІЧ

**ПАМОЧНІК РЭЖЫСЁРА, ЗАГАДЧЫК МАСТАЦКА-ПАСТАНОВАЧНАЙ ЧАСТКІ ТЭАТРАЎ Г. МІНСКА, ЗЯЦЬ С.П. ШКОЛЬНІКАВА**

**14 МАЯ 1914 Г. – [ПАЧ. 2000-Х ГГ.]**

**ФОНД № 389**

**ВОПІС № 1**

**[пач. XX ст.], 1949 – 1978**

**МІНСК 2019**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 389**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ С.П. ШКОЛЬНІКАВА | 1-41 | 1-6 |
| 1.1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ С.П. ШКОЛЬНІКАВА | 1-10 | 1-2 |
| 1.1.1. | ФАТАГРАФІІ АКЦЁРАЎ У ГРЫМЕ, СТВОРАНЫМ С.П. ШКОЛЬНІКАВЫМ, І ІНШ. | 1-7 | 1-2 |
| 1.1.2. | "УЧЕБНЫЕ АЛЬБОМЫ", УКЛАДЗЕНЫЯ С.П. ШКОЛЬНІКАВЫМ ДЛЯ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ У [БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ ТЭАТРАЛЬНА-МАСТАЦКІМ ІНСТЫТУЦЕ] | 8-10 | 2 |
| 1.2. | ПІСЬМЫ С.П. ШКОЛЬНІКАВУ | 11-12 | 2-3 |
| 1.3. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ С.П. ШКОЛЬНІКАВА | 13-30 | 3-5 |
| 1.3.1. | АФІШЫ СПЕКТАКЛЯ І ВЫСТАЎКІ З УДЗЕЛАМ С.П. ШКОЛЬНІКАВА І ІНШ. | 13-16 | 3 |
| 1.3.2. | ДАКУМЕНТЫ ДА ЮБІЛЕЯЎ С.П. ШКОЛЬНІКАВА | 17-19 | 3-4 |
| 1.3.3. | ГАНАРОВЫЯ ГРАМАТЫ С.П. ШКОЛЬНІКАВА І ІНШ. | 20-28 | 4-5 |
| 1.3.4. | ДАКУМЕНТЫ ПРА І З УПАМІНАННЕМ С.П. ШКОЛЬНІКАВА | 29-30 | 5 |
| 1.4. | ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ С.П. ШКОЛЬНІКАВЫМ ПА ЦІКАВЫХ ДЛЯ ЯГО ТЭМАХ | 31-35 | 5 |
| 1.5. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 36-41 | 5-6 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ А.С. САГАЛЬЧЫКА | 42-68 | 6-10 |
| 2.1. | АРТЫКУЛЫ І АЎТАБІЯГРАФІЯ А.С. САГАЛЬЧЫКА | 42-43 | 6 |
| 2.2. | ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА І ПІСЬМЫ А.С. САГАЛЬЧЫКУ | 44-45 | 6-7 |
| 2.3. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ А.С. САГАЛЬЧЫКА | 46-65 | 7-10 |
| 2.3.1. | ДАКУМЕНТЫ АБ ПРАЦЫ Ў ДЗЯРЖАЎНЫМ РУСКІМ ДРАМАТЫЧНЫМ ТЭАТРЫ БССР ІМЯ М. ГОРКАГА, ТЮГУ БССР І ІНШ. | 46-60 | 7-9 |
| 2.3.2. | ГАНАРОВЫЯ ГРАМАТЫ А.С. САГАЛЬЧЫКА | 61-65 | 9-10 |
| 2.4. | АРТЫКУЛ ПРА А.С. САГАЛЬЧЫКА, ЯГО ФАТАГРАФІІ І ІНШ. | 66-68 | 10 |

## Прадмова

**Школьнікаў Сямён Пейсахавіч** нарадзіўся 4 (17) кастрычніка 1901 г. у сям'і тэатральнага грымёра ў г. Магілёве. З [1915 г.] дапамагаў у працы бацьку. З 1921 г. працаваў грымёрам у тэатрах г. Магілёва, потым – г. Энгельса (Саратаўская вобласць, Расія), з 1944 да 1971 гг. – у Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР імя М. Горкага (цяпер – Нацыянальны акадэмічны рускі драматычны тэатр імя М. Горкага). У 1923–1930 гг. вучыўся жывапісу ў Ю. Пэна ў г. Віцебску, спрабаваў сябе ў скульптуры. З 1960 г. да сваёй смерці выкладаў у Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце (цяпер – Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў).

Найбольш вядомыя работы С.П. Школьнікава: партрэтны грым Леніна для акцёраў П.С. Малчанава і А.А. Даброціна (спектаклі Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага "Кремлевские куранты" М.Ф. Пагодзіна (1956) і "Шестое июля" М.П. Шатрова (1966) і А.М. Генералава (оперны спектакль ДАВТа БССР "Октябрь" В. Мурадэлі, 1965); партрэтны грым Перазвонава для М.Ф. Астангава (спектакль Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага "Чёрные птицы" М.Ф. Пагодзіна, [1970-я гг.]) і інш.

Аўтар кніг: "Искусство грима" (г. Мінск, 1962), "Грим: учебное пособие для театральных учебных заведений" (г. Мінск, 1969), "Причёски, головные уборы и украшения для сцены: учебное пособие для студентов театральных учебных заведений" (г. Мінск, 1975), "Основы сценического грима: учебное пособие для театральных учебных заведений" (г. Мінск, 1976); "Historialliset päähineet, kampaukset ja koru" ("Гістарычныя галаўныя ўборы, прычоскі і ўпрыгожанні") (г. Хельсінкі, 1984).

У 1966 г. атрымаў званне "Заслужаны дзеяч культуры БССР". Узнагароджаны Ганаровымі граматамі Прэзідыумаў Вярхоўнага Савета БССР (1955) і Азербайджанскай ССР (1958).

С.П. Школьнікаў памёр 7 мая 1977 г. Пахаваны на Паўночных могілках у г. Мінску.

**Сагальчык Аляксандр Самуілавіч** нарадзіўся 1 (14) мая 1914 г. у сям'і рамесніка ў г. Мінску. У 1929 г. скончыў сямігадовую школу № 12 г. Мінска. У 1931–1933 гг. працаваў рознарабочым на цагельным заводзе № 10 і вучыўся ў вячэрняй школе рабочай моладзі № 2. У апошні год навучання наведваў тэатральную студыю пры Мінскім тэатральным вучылішчы, браў удзел у самадзейных спектаклях. У 1933 г. працаваў электрыкам на будаўніцтве газатурбіннай установкі № 1. Адначасна ўдзельнічаў у спектаклях аматарскага калектыву пры Клубе будаўнікоў. У 1935 г. па конкурсу быў прыняты ў акцёрскі склад ТЮГа БССР, дзе працаваў акцёрам і памочнікам рэжысёра да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. З 1941 г. да 1948 г. знаходзіўся ў шэрагах Чырвонай арміі. У кастрычніку 1941 г. трапіў у акружэнне і нямецкі палон. У сакавіку 1942 г. быў прысуджаны да растрэлу пад г. Бабруйскам. Уцёк з-пад растрэлу, зноў трапіў у палон і быў вывезены ў Германію ў лагер для ваеннапалонных, дзе знаходзіўся да канца вайны. Пасля вызвалення з лагера працаваў у Германіі. Напачатку – у савецкай Місіі па рэпатрыяцыі савецкіх грамадзян на радзіму, з кастрычніка 1945 г. да кастрычніка 1948 г. – перакладчыкам нямецкай мовы ў ваеннай частцы № 96403"С".

У 1948 г. вярнуўся ў г. Мінск і быў залічаны памочнікам рэжысёра ў Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР, з 1950 г. да 1962 г. працаваў загадчыкам яго мастацка-пастановачнай часткі. З 1962 г. да 1965 г. быў загадчыкам майстэрні па вырабу дэкарацый вытворчага камбіната Вялікага акадэмічнага тэатра оперы і балета БССР (цяпер – Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь), з 1965 г. да 1975 г. – загадчыкам мастацка-пастановачнай часткі Беларускага рэспубліканскага ТЮГа імя 50-годдзя Камсамола Беларусі (цяпер – Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача), з 1975 г. да 1978 г. – загадчыкам мастацка-пастановачнай часткі ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы (цяпер – Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы). З 1978 г. да 1985 г. – працаваў вучэбным майстрам у Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце. У 1986 г. выйшаў на пенсію.

Узнагароджаны Ганаровымі граматамі Прэзідыумаў Вярхоўнага Савета БССР (1955) і Азербайджанскай ССР (1958), медалямі “За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941–1945 гг.”, “50 лет Вооружённых сил СССР”, “За доблестный труд в ознаменовании 100-летия со дня рождения В.И. Ленина” і “Ветеран труда”.

С.А. Сагальчык памёр у [пач. 2000-х гг.] і быў пахаваны на Паўночных могілках ў г. Мінску.

Дакументы С.П. Школьнікава і С.А. Сагальчыка паступілі ў БДАМЛМ ад С.А. Сагальчыка ў 1994 г. У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 1, у які ўвайшлі 68 спраў (196 дак.) за [пач. XX ст.], 1949–1978 гг.

Вопіс складаецца з 2 раздзелаў:

Першы раздзел – “Дакументы С.П. Школьнікава” – складаецца з 5 падраздзелаў, у якіх змешчаны фатаграфіі акцёраў у грыме, створаным С.П. Школьнікавым, фатаграфіі яго скульптурных работ і інш.; вучэбныя альбомы, укладзеныя С.П. Школьнікавым; пісьмы С.П. Школьнікаву; дакументы да яго біяграфіі (афішы спектакля і выстаўкі з яго ўдзелам, дакументы да юбілеяў, ганаровыя граматы і інш.); дакументы пра і з яго ўпамінаннем; дакументы, сабраныя па цікавых для яго тэмах; выяўленчыя дакументы. Справы ў раздзеле сфарміраваны па жанрах і храналогіі за [пач. XX ст.], 1951–1977 гг.

Другі раздзел – “Дакументы А.С. Сагальчыка” – прадстаўлены 4 падраздзеламі, у якія ўвайшлі артыкулы і аўтабіяграфія А.С. Сагальчыка; пісьмы А.С. Сагальчыку; дакументы да яго біяграфіі (даведка аддзела кадраў, характарыстыкі, праграмы спектакляў з яго удзелам, ганаровыя граматы і інш.); артыкул пра А.С. Сагальчыка, яго фатаграфіі і інш. Справы ў раздзеле сфарміраваны па жанрах і храналогіі за 1949–1978 гг.

Прадмову склала

Вядучы архівіст В.Ф. Шаталава

30.10.2019

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

_____________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ДАКУМЕНТЫ С.П. ШКОЛЬНІКАВА** | | | | |
| | **1.1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ С.П. ШКОЛЬНІКАВА** | | | | |
| | **1.1.1. ФАТАГРАФІІ АКЦЁРАЎ У ГРЫМЕ, СТВОРАНЫМ С.П. ШКОЛЬНІКАВЫМ, І ІНШ.** | | | | |
| 1 | Фатаграфія Ю.У. Талубеева ў ролі Важака ("Оптимистическая трагедия" па п'есе У.В. Вішнеўскага, рэж. М.Л. Співак, грым С.П. Школьнікава), сыгранай у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага. Фатаграфіі бюста Ю.У. Талубеева ў ролі Важака (скульптар С.П. Школьнікаў) | 1962-1965 | 4 | 4 | |
| 2 | Фатаграфія Г.К. Някрасава ў ролі М.В. Гогаля з неўстаноўленай тэлеперадачы (грым С.П. Школьнікава) | [1970-я гг.] | 1 | 1 | |
| | *           *           * | | | | |
| 3 | Фатаграфіі С.П. Школьнікава ў час накладання грыму І.У. Ільінскаму для ролі Акіма ў спектаклі "Власть тьмы" па п'есе Л.М. Талстога Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага | 1963 | 2 | 2 | |
| 4 | Фатаграфіі С.П. Школьнікава ў час накладання грыму для ролі У.І. Леніна А.М. Генералаву для опернага спектакля "Октябрь" В.І. Мурадэлі ДАВТа БССР і І.Б. Шаціле для спектакля "Цветы живые" па п'есе М.Ф. Пагодзіна [Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага]. Фатаграфія А.А. Даброціна ў ролі У.І. Леніна ("Шестое июля" па п'есе М.П. Шатрова, рэж. П.П. Васільеў, грым С.П. Школьнікава), сыгранай у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага | 1965-1966 | 3 | 3 | |
| 5 | Фатаграфіі С.П. Школьнікава ў час накладання грыму М.Ф. Астангаву для ролі Перазвонава ў спектаклі "Чёрные птицы" па п'есе М.Ф. Пагодзіна Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага | [1970-я гг.] | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | * * * | | | | |
| 6 | Фатаграфія скульптурнага аўтапартрэта С.П. Школьнікава | 1975 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 7 | "Як самому зрабіць парык, бараду і вусы". Адказ С.П. Школьнікава на пісьмо чытача ў неўстаноўленай газеце. Выразка з газеты | [да 1971 г.] | 1 | 1 | |
| | **1.1.2. "УЧЕБНЫЕ АЛЬБОМЫ", УКЛАДЗЕНЫЯ С.П. ШКОЛЬНІКАВЫМ ДЛЯ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ У [БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ ТЭАТРАЛЬНА-МАСТАЦКІМ ІНСТЫТУЦЕ]** | | | | |
| 8 | "Учебный альбом № 1", укладзены С.П. Школьнікавым для практычных заняткаў у [Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце], з уклеенымі фатаграфіямі эскізаў тэатральных лялек С.П. Школьнікава (31), С.У. Абразцова і інш., вокладак манаграфій, прысвечаных батлейцы, тэатру лялек і інш. | [1975-1977] | 145 | 1/137 | |
| 9 | "Учебный альбом № 2", укладзены С.П. Школьнікавым для практычных заняткаў у [Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце], з уклеенымі фатаграфіямі лялек і сцэн з спектакляў Горкаўскага тэатра лялек, Маскоўскага Цэнтральнага тэатра лялек, Мурманскага абласнога тэатра лялек і інш. | [1975-1977] | 209 | 1/170 | |
| 10 | "Учебный альбом № 3", укладзены С.П. Школьнікавым для практычных заняткаў у [Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце], з уклеенымі фатаграфіямі эскізаў тэатральных лялек, схем і малюнкаў па тэхналогіі лялькі і інш. | [1975-1977] | 175 | 1/168 | |
| | **1.2. ПІСЬМЫ С.П. ШКОЛЬНІКАВУ** | | | | |
| 11 | Пісьмо акцёраў тэатра юнацкай творчасці Мінскага палаца піянераў і школьнікаў С.П. Школьнікаву з падзякай за дапамогу, аказаную ў правядзенні спектакля "Юность отцов" | 1969 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 12 | Пісьмо і ксеракопія дароўнага надпісу І.У. Ільінскага С.П. Школьнікаву (Расія) | 1962, 1966 | 3 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1.3. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ С.П. ШКОЛЬНІКАВА** | | | | |
| | **1.3.1. АФІШЫ СПЕКТАКЛЯ І ВЫСТАЎКІ З УДЗЕЛАМ С.П. ШКОЛЬНІКАВА І ІНШ.** | | | | |
| 13 | Брашура, прысвечаная Дзяржаўнаму рускаму драматычнаму тэатру БССР імя М. Горкага, з упамінаннем С.П. Школьнікава і А.С. Сагальчыка | 1959 | 27 | 1 | |
| 14 | Афіша спектакля "Шестое июля" Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага з упамінаннем С.П. Школьнікава | 1966 | 1 | 1 | |
| 15 | Каталог "Выставки изобразительного и прикладного творчества самодеятельных художников г. Минска, посвящённая 50-летию Великого Октября (живопись, графика, скульптура, резьба, керамика)" з удзелам С.П. Школьнікава | 1967 | 11 | 1 | |
| 16 | Афіша выстаўкі самадзейных скульптараў К. Гелашвілі, Л. Пісмена і С.П. Школьнікава ў Доме работнікаў мастацтваў у г. Мінску | 1971 | 1 | 1 | |
| | **1.3.2. ДАКУМЕНТЫ ДА ЮБІЛЕЯЎ С.П. ШКОЛЬНІКАВА** | | | | |
| 17 | Віншавальныя адрасы Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, Беларускага тэатральнага таварыства, Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага, Міністэрства культуры БССР і інш. С.П. Школьнікаву з 50-, 60-, 70- і 75-годдзямі з дня нараджэння з персанальнымі пажаданнямі А.Ф. Кашкера, В.З. Краўчанкі, Г.К. Някрасава, Я.А. Палосіна і інш. і маляваным партрэтам С.П. Школьнікава (акварэль, аловак). Лл. 1-2 | 1951-1976 | 18 | 12 | |
| 18 | Віншавальная тэлеграма калектыва Гомельскага абласнога драматэатра С.П. Школьнікаву з 75-годдзем з дня нараджэння | 1976 | 1 | 1 | |
| 19 | Ганаровая грамата Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута на імя С.П. Школьнікава з нагоды 75-годдзя з дня яго нараджэння | 1976 | 1 | 1 | |
| 20 | Альбом з фатаграфіямі С.П. Школьнікава, індывідуальнымі, у групах з Э.П. Герасімовіч, Я.А. Громавым, А.І. Шах-Парон, Р.І. Янкоўскім, | [1976] | 49 | 1/49 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | сынамі і ўнучкай і інш. у час [святкавання 75-годдзя С.П. Школьнікава ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце] | | | | |
| | **1.3.3. ГАНАРОВЫЯ ГРАМАТЫ С.П. ШКОЛЬНІКАВА І ІНШ.** | | | | |
| 21 | Ганаровая грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР на імя С.П. Школьнікава "ў сувязі з Дэкадай беларускага мастацтва і літаратуры ў г. Маскве" | 1955 | 1 | 1 | |
| 22 | Ганаровыя граматы і падзякі БРК прафсаюза работнікаў культуры, ЦК камісіі па культурным шэфстве над Узброенымі Сіламі СССР і інш. на імя С.П. Школьнікава "за актыўны ўдзел у ваенна-шэфскай рабоце над Узброенымі Сіламі СССР" і інш. | 1957-1969 | 6 | 5 | |
| 23 | Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Азербайджанскай ССР аб узнагароджанні ганаровымі граматамі С.П. Школьнікава і А.С. Сагальчыка. Выразка з газеты | 1958 | 1 | 1 | |
| 24 | Ганаровая грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета Азербайджанскай ССР на імя С.П. Школьнікава "за паспяховыя выступленні перад працоўнымі ў г. Баку ў перыяд гастроляў" | 1958 | 2 | 1 | |
| 25 | Граматы і дыпломы аргкамітэта і журы па правядзенні выставак работ самадзейных мастакоў г. Мінска С.П. Школьнікаву | 1962-1970 | 4 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 26 | Ганаровая грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР на імя С.П. Школьнікава аб прысваенні звання "Заслужаны дзеяч культуры БССР" | 1966 | 1 | 1 | |
| 27 | Віншавальнае пісьмо БРК прафсаюзаў работнікаў культуры С.П. Школьнікаву з прысваеннем звання "Заслужаны дзеяч культуры БССР" | 1966 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 28 | Ганаровыя граматы Міністэрства культуры БССР, Міністэрства культуры СССР і інш. на імя С.П. Школьнікава "за плённую працу ў галіне культуры і мастацтва", "шматгадовую плённую працу ў Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР імя М. Горкага" і інш. | 1967-1971 | 5 | 3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 29 | Ганаровыя граматы Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута на імя С.П. Школьнікава "за паспяховую працу па падрыхтоўцы работнікаў тэатральнага мастацтва" і інш. | 1970-1973 | 4 | 4 | |
| | **1.3.4. ДАКУМЕНТЫ ПРА І З УПАМІНАННЕМ С.П. ШКОЛЬНІКАВА** | | | | |
| 30 | У. Багалюбскі. "Рысы тысячы твараў", С. Грабоўскі. "Майстэрства грымёра". Артыкулы пра С.П. Школьнікава. Выразкі з газет | 1962, 1970 | 2 | 2 | |
| 31 | А. Ладыгіна. "Октябрь" на белорусской сцене", Л. Старыкава. "Мастер живых портретов" і інш. Артыкулы і нататкі з упамінаннем С.П. Школьнікава. Выразкі з газет | 1964-1970 | 8 | 5 | |
| | **1.4. ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ С.П. ШКОЛЬНІКАВЫМ ПА ЦІКАВЫХ ДЛЯ ЯГО ТЭМАХ** | | | | |
| 32 | "Парикмахеръ И. Андреев и Ко". Ілюстраваны каталог прычосак. Друкаванае выданне | [пач. XX ст.] | 23 | 1 | |
| 33 | "Фабрика волосяных изделій. Владелець П.Д. Горбатовъ". Ілюстраваны прэйскурант на 1912-1913 гг. Друкаванае выданне | | 30 | 1 | |
| 34 | Рэкламныя ўлёткі з выявамі парыкоў, манікенаў і інш. фабрыкі валасяных покрываў "Поль" і спецыяльнага склада выставачнага абсталявання Ф. Чарнага | 1914, [да 1917 г.] | 3 | 2 | |
| 35 | Праграмы спектакляў "Иркутская история" па п'есе А.М. Арбузава Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я.Б. Вахтангава і "Братья Карамазовы" паводле твору Ф.М. Дастаеўскага Маскоўскага мастацкага тэатра СССР імя М. Горкага | [1959], 1962/1963 | 4 | 2 | |
| 36 | Артыкулы пра жаночыя і мужчынскія прычоскі і інш. На польскай і рускаx мовах. Выразкі з газет і часопісаў | 1961-1969 | 8 | 7 | |
| | **1.5. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 37 | Экслібрыс С.П. Школьнікава неўстаноўленага аўтара. Папера, [дрэварыт] | [1960-я - 1970-я гг.] | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | * * * | | | | |
| 38 | Фатаграфія С.П. Школьнікава, індывідуальная | [1960-я гг.] | 1 | 1 | |
| 39 | Фатаграфіі С.П. Школьнікава ў групах з Я.А. Громавым, К.В. Мамацюком і інш. перад банкетам выпускнікоў спецыяльнасці "Культурна-асветніцкая работа" Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута | 1975 | 4 | 4 | |
| 40 | Фатаграфіі С.П. Школьнікава з неўстаноўленымі асобамі ў час працы над парыком [у тэатральнай грымёрцы] | [1970-я гг.] | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 41 | Фатаграфія надмагільнага помніка з бюстам С.П. Школьнікава | 1977 | 1 | 1 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ А.С. САГАЛЬЧЫКА** | | | | |
| | **2.1. АРТЫКУЛЫ І АЎТАБІЯГРАФІЯ А.С. САГАЛЬЧЫКА** | | | | |
| 42 | "Грым - сур'ёзны, грым - кур'ёзны" = "Актёр и гримёр", "Што бачыць і чаго не бачыць глядач". Артыкулы і нататка (у т.л. з упамінаннем С.П. Школьнікава).<br>Аўтарызаваны машынапіс, машынапіс з нязначным допісам А.С. Сагальчыка, выразкі з газет | 1963 - [да 1975 г.] | 16 | 6 | |
| 43 | Аўтабіяграфія А.С. Сагальчыка. Фрагменты. Аўтограф | 1971 | 2 | 1 | |
| | **2.2. ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА І ПІСЬМЫ А.С. САГАЛЬЧЫКУ** | | | | |
| 44 | Віншавальная паштоўка А.В. Вольскага, [Ю.М. Тура], М.А. Шымко і інш. А.С. Сагальчыку | [1972-1975] | 2 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 45 | Пісьмы дзяржаўнага інстытута па праектаванню тэатральна-відовішчных прадпрыемстваў "ГИПРОТЕАТР" і інш. А.С. Сагальчыку па пытанні публікавання яго артыкулаў | [1965-1975], 1967 | 2 | 2 | |
| | **2.3. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ А.С. САГАЛЬЧЫКА** | | | | |
| | **2.3.1. ДАКУМЕНТЫ АБ ПРАЦЫ Ў ДЗЯРЖАЎНЫМ РУСКІМ ДРАМАТЫЧНЫМ ТЭАТРЫ БССР ІМЯ М. ГОРКАГА, ТЮГУ БССР І ІНШ.** | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 46 | Даведка аддзела кадраў і навучальных устаноў Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Савеце Міністраў БССР аб працы А.С. Сагальчыка ў ТЮГе БССР, пасведчанне Усесаюзнага інстытута павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры на імя А.С. Сагальчыка аб праходжанні "семінара загадчыкаў пастановачнай часткі драмтэатраў" | 1950, 1972 | 2 | 2 | |
| 47 | Загад па Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР імя М. Горкага аб аб'яўленні падзякі з занясеннем у асабістую справу в.а загадчыка пастановачнай часткай А.С. Сагальчыку "за падрыхтоўку гастроляў у г. Віцебску і г. Магілёве і выпуск спектакля "Право на счастье" па п'есе І.Л. Дорскага" | 1956 | 1 | 1 | |
| 48 | Запрашальныя білеты Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага, Міністэрства асветы і Міністэрства культуры БССР і інш. А.С. Сагальчыку на адкрыццё ТЮГа БССР, урачысты сход да 25-годдзя Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага і інш. | 1956-1961 | 3 | 3 | |
| 49 | Характарыстыкі дырэктара Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы І.Ф. Міхалюты і дырэктара Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага Ю.М. Сідарава на загадчыка мастацка-пастановачнай часткай А.С. Сагальчыка | 1962, 1978 | 2 | 2 | |
| 50 | Вытворчы план ТЮГа БССР на 1970 год, складзены А.С. Сагальчыкам | 1969 | 1 | 1 | |
| 51 | Пісьмо Міністра культуры БССР М.А. Мінковіча дырэктару ТЮГа БССР А.В. Вольскаму і дырэктару ДАВТа БССР І.П. Паліводзе з просьбай дазволіць А.С. Сагальчыку (і адначасова І.М. Рыдзеўскаму і А.І. Савельеву) у нерабочы час выконваць працу па распрацоўцы тэхналагічнай часткі праекта рэканструкцыі тэатра ў г. Бабруйску | 1971 | 1 | 1 | |
| 52 | Планы сцэн Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага, Львоўскага акадэмічнага тэатра імя М.К. Занькавецкай, Маскоўскага мастацкага акадэмічнага тэатра СССР імя М. Горкага і інш. Папера, шарыкавая ручка, друкаваныя выданні | [1960-я - 1970-я гг.] | 11 | 11 | |
| | * * * | | | | |
| 53 | Праграмы спектакляў "Вторая любовь", "Дядя | 1949-1951 | 22 | 11 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Ваня", "За Вторым фронтом" і інш. Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР з упамінаннем С.П. Школьнікава і А.С. Сагальчыка і з віншаваннямі з прэм'ерай і падзякай за працу Б.Я. Малкіна, С.Ф. Уладычанскага, Н.І. Шчэпетавай і інш. А.С. Сагальчыку | | | | |
| 54 | Праграмы спектакляў "Варвары", "Не называя фамилий", "Шакалы" і інш. Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР з упамінаннем С.П. Школьнікава і А.С. Сагальчыка і з віншаваннямі з прэм'ерай і падзякай за работу А.Б. Грыгар'янца, І.П. Лакштанава, А.Г. Маркавай, А.М. Трошынай-Дэйнэкі, В.Ф. Фёдарава і інш. А.С. Сагальчыку | 1952-1955 | 24 | 10 | |
| 55 | Праграмы Дэкады беларускага мастацтва і літаратуры ў г. Маскве і спектакляў Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР з упамінаннем С.П. Школьнікава і А.С. Сагальчыка і падзякай О.А. Гантмана С.П. Школьнікаву, А.Б. Грыгар'янца і В.А. Кляшчэўскага А.С. Сагальчыку | 1955 | 35 | 2 | |
| 56 | Праграмы спектакляў "Венецианские близнецы", "Доктор", "Мёртвая хватка" і інш. Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР з удзелам С.П. Школьнікава і А.С. Сагальчыка і віншаваннямі з прэм'ерай і падзякай за работу С.І. Галузы, А.Б. Грыгар'янца, В.А. Кляшчэўскага, Л.І. Мазалеўскай, І.В. Уфімцава, В.Ф. Фёдарава і інш. А.С. Сагальчыку | 1956-1962 | 14 | 7 | |
| 57 | Праграмы спектакляў "Васса Железнова" па п'есе М. Горкага, "Дали неоглядные" па п'есе М.Я. Вірты, "Дальняя дорога" па п'есе А.М. Арбузава і інш. Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага з віншаваннямі з прэм'ерай і падзякай за працу [М.А. Бондарава], А.Б. Грыгар'янца, В.А. Кляшчэўскага, І.П. Лакштанава, Г.Я. Рэвы, М.Л. Співака, В.Ф. Фёдарава і інш. А.С. Сагальчыку | 1956-1958 | 22 | 11 | |
| 58 | Праграмы спектакляў "Барабанщица", "И один в поле воин", "Ненужная победа" і інш. Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага з віншаваннямі з прэм'ерай і падзякай за работу А.Б. Грыгар'янца, В.Н. Дакутовіча, В.П. Рэдліх, М.Л. Співака і інш. А.С. Сагальчыку | 1959-1962 | 24 | 12 | |
| 59 | Праграмы спектакляў "З любімымі не | 1966-1975 | 15 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | расставайцеся", "Прыгоды Бураціна", "Чалавек, падобны да самога сябе" і інш. ТЮГа БССР з віншаваннямі з прэм'ерай і падзякамі і аўтографамі А.М. Валодзіна, А.В. Вольскага, М.Б. Лур'е, Ю.М. Тура, А.Я. Шапіры, М.А. Шыйко і інш. А.С. Сагальчыку | | | | |
| 60 | Праграма спектакля "Навальніца" па п'есе А.М. Астроўскага тэатра імя Я. Купалы з падзякай за работу Л.Я. Хейфеца А.С. Сагальчыку | 1975 | 2 | 1 | |
| | **2.3.2. ГАНАРОВЫЯ ГРАМАТЫ А.С. САГАЛЬЧЫКА** | | | | |
| 61 | Ганаровая грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР А.С. Сагальчыку "ў сувязі з Дэкадай беларускага мастацтва і літаратуры ў г. Маскве" | 1955 | 1 | 1 | |
| 62 | Ганаровыя граматы і граматы Беларускай ваеннай акругі, Ленінскага райкама КПБ г. Мінска і ЛКСМБ і інш. А.С. Сагальчыку "за актыўную работу па культурнаму шэфству над Узброеннымі Сіламі СССР" і інш. | 1957-1974 | 4 | 4 | |
| 63 | Ганаровыя граматы Міністэрства культуры БССР, Міністэрства культуры СССР, ЦК і БРК прафсаюза работнікаў культуры А.С. Сагальчыку "за выдатную працу" і ў сувязі з 40- і 50-годдзем Кастрычніцкай рэвалюцыі і 50-годдзем утварэння БССР і Кампартыі Беларусі | 1957-1969 | 5 | 3 | |
| 64 | Ганаровая грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета Азербайджанскай ССР А.С. Сагальчыку "за паспяховыя выступленні перад публікай г. Баку ў час гастроляў" | 1958 | 2 | 1 | |
| 65 | Ганаровыя граматы Прэзідыума Беларускага тэатральнага аб'яднання, Міністэрства культуры БССР і інш. А.С. Сагальчыку "за шматгадовую плённую працу" і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння | 1974 | 4 | 3 | |
| | **2.4. АРТЫКУЛ ПРА А.С. САГАЛЬЧЫКА, ЯГО ФАТАГРАФІІ І ІНШ.** | | | | |
| 66 | І. Бур'ян. "Начальнік тылу". Артыкул пра А.С. Сагальчыка. Выразка з газеты | 1970 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 67 | Г.І. Барышаў. "Техника сцены и художественное оформление спектакля". Тэматычны план і | 1977, 1978 | 19 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | праграма курса для спецыяльнасці "Кіраўнік самадзейнага тэатральнага калектыва". Варыянты. Аўтограф, машынапіс | | | | |
| | * * * | | | | |
| 68 | Фатаграфіі А.С. Сагальчыка, індывідуальныя | 1967/1968, 1970 | 2 | 2 | |

У дадзены вопіс унесена 68 (шэсцьдзесят восем)

спраў з № 1 па № 68 , 196 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку фонда зрабіла

вяд. архівіст В.Ф. Шаталава

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.